# Ніл Сымонавіч Гілевіч



“…усё самае галоўнае, самае істотнае і важнае, што ёсць у кожным дарослым чалавеку, – усё адтуль, з гадоў дзяцінства. Там – незабыўныя радасці адкрыцця і пазнання свету, першаснага яднання душы і сэрца з ім, першых сустрэч з векавечнымі і заўсёды новымі цудамі прыроды, першага, яшчэ не ўсвядомленага ўспрымання ласкі, дабрыні і спагады, даверлівасці і ўдзячнасці” (Н. Гілевіч)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Ніл Гілевіч. Хто ён?



- Паэт-лірык
- Сатырык
- Публіцыст
- Драматург
- Палымяны прамоўца
- Грамадскі дзеяч
- Вучоны
- Фальклярыст
- Перакладчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



# Біяграфія

- Ніл Сямёнавіч Гілевіч нарадзіўся 30 верасня 1931 года ў вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці.
- Бацька будучага пісьменніка Сымон Пятровіч вельмі рана ўсіх ацеў працаваў старшынёй сельсавета, сакратаром РВК. Заняты службовымі клопатамі, дома бываў рэдка.
- Турботамі аб выхаванні трох дачок і пяці сыноў жыла маці – Кацярына Мікалаеўна. Менавіта яна перадала ў спадчыну сваму сыну Нілу тую выключную цягавітасць, якой здзіўляюцца сёння даследчыкі яго творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



# Біяграфія



- Першыя гады пасля Вялікай айчыннай вайны працаваў калгасным паштальёнам.
- У 1951 скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча. Апошні год вучобы спалучаў з працай настаўніка ў адной са школ Мінска.
- Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1954).
- Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1956), пасля аспірантуру пры ім.
- Кандыдат філалагічных навук (1963), прафесар (1978). З 1960 па 1986 - супрацоўнік кафедры беларускай літаратуры БДУ.
- З 1958 да 1963 працаваў таксама літкансультантам газеты "Звязда". З 1980 да 1989 - першы сакратар праўлення СП БССР, у 1981-1991 сакратар праўлення СП СССР. У 1980 годзе яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Творчасць

- Першы верш Н.Гілевіча “Яблынька” быў надрукаваны ў 1946 годзе ў часопісе “Бярозка”. Пятнаццацігадовы аўтар расказваў пра салдата, які перад самай вайной пасадзіў дзічку, прышчапіў яе і праз усё ваеннае ліхалецце пранёс надзею на сустрэчу з ёю.
- У 1947 годзе шаснаццацігадовага паэта, вершы якога сталі рэгулярна з’яўляцца на старонках газет, запрасілі на Першую рэспубліканскую нараду маладых пісьменнікаў. У гэтым жа годзе Н.Гілевіч паступае ў Мінскае педагагічнае вучылішча, на апошнім курсе якога становіцца членам літаратурнага аб’яднання пры “Чырвонай змене”. Педвучылішча закончыў на выдатна і без экзаменаў быў прыняты на філалагічны факультэт БДУ.
- У 1954 годзе Н.Гілевіча, студэнта трэцяга курса, прымаюць у Саюз пісьменнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




# Творчасць

- У 1957 годзе выходзіць першы зборнік вершаў і песняў Ніла Гілевіча “Песня ў дарогу”. Крытыкі ахарактарызуюць гэтую кнігу як паэтычны маніфест студэнтаў-рамантыкаў 50-х гадоў, пераважна вясковых хлопцаў і дзяўчат.
- Ужо на першым этапе сваёй творчасці Ніл Гілевіч змог выразна акрэсліць аўтарскую пазіцыю. Яна выяўляецца ў лірычным, амаль малітоўным услаўленні малой радзімы і вялікай Бацькаўшчыны, беларускае Маці і роднае мовы, чалавечай дабрыні, асэнсаванні беларускай гісторыі, бескампрамісным адмаўленні рэнегатства, бездухоўнасці, здрады




РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# Творчасць





- Дэбютаваў у друку з вершамі ў 1946.
- Аўтар кніг паэзіі "Песня ў дарогу" (1957), "Прадвесне ідзе па зямлі" (1959), "Неспакой" (1961), "Бальшак" (1965), "Пеaccording разовы" (1967), "Лісце трыпутніку" (1968), "А дзе ж тая крынічанька" (1972), "Запаветнае" (1975), "Актавы" (1976), "У добрай згодзе" (лірыка, гумар і сатыра, 1979), "Святлынь" (1984), "Повязь" (1987), "Як дрэва карэннем" (1986), рамана ў вершах "Родныя дзеці" (1985), а таксама зборнікі сатыры і гумару "Званковы валет" (1961), "Да новых венікаў" (1963), "Ці грэх, ці 2" (1970), "Як я вучыўся жыць" (1974), "Русалка на Нарачы" (1974), "Кантора" (1989), "Дыялог на хаду" (1990).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Творчасць




- Выдаў зборнікі вершаў і паэм для дзяцей "Сцяжок на мачце" (1959), "Сіні домік, сіні дом" (1961), "Зялёны востраў" (1963), "Дождж-грыбасей" (1966), "Загадкі" (1971), "Калі рана ўстанеш" (1984), "Добры чалавек" (1987).
- Выдаў зборнік п'ес "Начлег на буслянцы" (1980) і аповесць "Перажыўшы вайну" (1988).
- Аўтар кніг па літаратуразнаўству і фалькларыстыцы "Акрыленая рэвалюцыяй" (Паэзія "Маладняка") (1962), "Наша родная песня" (1968), "З клопатам пра песні народа" (1970), "Паэтыка беларускай народнай лірыкі" (1975), "Паэтыка беларускіх загадак" (1976), "Верная вялікім запаветам: Сучасная балгарская паэзія. 1956-1976" (1977), "Вусная народная творчасць і сучасная лірычная паэзія ўсходніх і паўднёвых славян" (1978), зборнікаў літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў "У гэта веру" (1978), "Удзячнасць і абавязак" (1982), "Покліч жыцця і часу" (1983), "Годнасць, сумленнасць, мужнасць" (1988), "Вяртанне і працяг" (1990).




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Творчасць

- Укладальнік і навуковы рэдактар фальклорных зборнікаў "Песні сямі вёсак" (1973), "Песні народных свят і абрадаў" (1974), "Лірычныя песні" (1976), "Лірыка беларускага вяселля" (1979), "Народныя казкі, байкі, апавяданні і мудраслоўі" (1983).
- Працуе ў галіне перакладу. Пераклаў на беларускую мову твора звыш 400 славянскіх паэтаў і пісьменнікаў (балгарскіх, славенскіх, сербскіх, украінскіх, польскіх, рускіх, лужыцкіх і інш.
- Перакладае таксама з рускай, украінскай, польскай, сербахарвацкай, лужыцкай і іншых моў.
- Творы Н. Гілевіча перакладаліся на шматлікія мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

МЫ –ТРОЙЧЫ ДЗЕЦІ Ў
ВЕЧНЫМ КРУЗЕ:
МЫ ДЗЕЦІ РОДНАЕ СЯМ'І,
І ДЗЕЦІ МАЦІ-БЕЛАРУСІ,
І ДЗЕЦІ МАТУХНЫ-ЗЯМЛІ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ТВОРЫ**

- Бездухоўнасці
- Сэнсу жыцця чалавека
- Экалогіі
- Еднасці чалавека з роднай зямлёй
- Шчырасць кахання і чалавечая здрада
- Забыццё роднай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Паэтычная старонка

Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты – мой, я – твой: ад роду і навек.
Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю
Твой ліст дубовы – як чароўны лек.
За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,
За шчасце звацца іменем тваім –
Паклон, паклон табе, мой родны краю!
Ты – мой, я – твой: усюды і ва ўсім!

Святочны, старажытны дух калядны,
Магічны дух язычніцкіх акрас,
Смалення дух, дух кміну і каляндры,
Дух на шасце падвешаных каўбас,
Калісьці ўсемагутны, усеўладны,
Што ж на куццю ты не збіраеш нас?
О, Божа! Што ў душы маёй паселіцца?
І з нашых хат, і з нашых песень-дум.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Жнівень, арэхі і жоўтыя восы,**
**Што зміналі цябе цалаваць.**
**Першы маток павуціны бялёсы.**
**Пах пераспелай травы ў галавах.**
**Недзе на пожні рыпелі калёсы.**
**Недзе натужна маторы гулі...**
**Грэшнае шчасце на грэшнай зямлі.**
**Жнівень... Арэхі... І жоўтыя восы…**

Сэрца маці!
Наш боль быў тваім,
Не іначай,
Сорам наш
Ты насіла вялізарным горам,
Кропля ж кожная
Радасці светлай дзіцячай
Напаўняла цябе,
Разлівалася морам...

“Маці”

Ах, якая над Гайнай купальская ноч!
Самы раз бы шукаць кветку-папараць,
Самы раз уплятаць летуценьні ў вянок,
Самы раз белы корань выкапываць!
Ды ні гуку над Гайнай – пад цёмным шатром.
Толькі зоркі – як вочкі Купаліны.
Дзе ж вы, хлопцы, дзяўчаты? Чаму за сялом,
Над ракою, агні не запалены?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Фотаальбом









РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ












РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ